*Энгельс Дарашэвіч*

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫЯ ІНТЭНЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ РЫГОРА ШЫРМЫ

Як падкрэслівае адзін з вядучых этнамузыколагаў Санкт-Пецярбурга Ігар Маціеўскі, «гістарычны досвед шматлікіх культур сведчыць, што менавіта ***этнічная музыка*** [*1] і падтрымка яе традыцый спрыялі захаванню таго ці іншага народа як самастойнага сацыякультурнага суб'екта» [3, *7*]. Рыгор Шырма ад пачатку свайго творчага шляху (які па многіх параметрах варта назваць «культуртрэгерскім») – ад Вільні 1920-х і далей – праз Беласток 1930-х, засценкі НКУС, ваенныя канцэрты Другой сусветнай, Гарадню 1940-х і ўжо на «фінішнай прамой» яго кар'еры – у Мінску 1950-70-х – усімі магчымымі і немагчымымі сродкамі бараніў права беларусаў на ўласную этнічную музыку, таленавіта і пераканаўча карыстаўся гэтым правам сам. Сучаснікі неаднаразова падкрэслівалі яго талент літаратара, імпэт і пераканаўчасць публіцыстыкі, поспехі на ніве асветы і – з асаблівым гонарам – адмысловасць яго вялікай музычнай адоранасці.

Постать Шырмы, аднаго з тытанаў беларускага Адраджэння ХХ ст. невыпадкова звязана з беларускім каранёвым меласам, у якім сінкрэтычна «зышліся» ментальнасць, аксіялогія, эстэтыка ды і адаптацыйная стратэгія беларусаў. І справа тут не толькі ў тым, што нават вялікі Платон, калі разважаў аб прыродзе сапраўднай паэзіі [*2], спасылаўся менавіта на ***народныя*** ўяўленні пра тэхналогію і асаблівасці паэтычнай творчасці [4, *223*]. Непераходзячую каштоўнасць этнічнага мастацтва дэкларуюць многія (калі не ўсе), але толькі адзінкі здольны комплексна «прапусціць» народны мелас і паэтыку роднага слова праз свае ўласныя галасавыя звязкі, сэрца і мозг. А потым – пралічыць бясконцую колькасць варыянтаў і знайсці аптымальны кірунак, у якім «сёння і зараз» трэба практычна рухаць «душу народа – песню», каб яна камернай, але ўпэўненай флейтай [*3]. «звязала» паміжсобку розныя эпохі гісторыі народа і назаўжды засталася яго абярэгам і паратункам ад небяспек, пакут і выпрабаванняў.

Выключнае «прафесійнае валоданне спецыфічнай – музычнай – мовай народнай песні, яе меласам» [1, *11*] дазволіла Шырму дасягнуць вельмі арганічнага заглыблення ў ментальнасць і культуру беларусаў, якое спрыяла (і на інтуітыўным, і на інтэлектуальным узроўні) дакладнаму разліку паспяховасці яго шматлікіх практычных культуртрэгерскіх пачынанняў у асяродку свайго народа. А паколькі ва ўсім свеце ў першую чаргу вітаюць і памятаюць «лица на общее выражение», маштаб асобы Рыгора Раманавіча і яго фундаментальны этнакультурны background сталіся галоўнай умовай паспяховай (нават бліскучай) творчай самарэалізацыі Шырмы і па-за межамі роднай Беларусі.

Сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў постаці Рыгора Шырмы беларусы мелі паспяховага стратэга нацыянальнага адраджэння,

*перавод стратэгіі ў практыку* (т. зв. інтэнцыі) дзейнасці якога «пакрываюць» некалькі напрамкаў развіцця айчыннай навукі і сацыякультурнай практыкі, звязаных з мастацтвам тытульнага этнасу нашай краіны.

У галіне навукі ён спраўдзіў сябе як *збіральнік фальклору, тэарэтык і метадолаг палявых даследаванняў, эдытар і друкар помнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў, бліскучы аналітык фальклору, філолаг і этнамузыколаг.* У галіне сацыякультурнай практыкі Рыгор Шырма неаднаразова меў поспех як *тэарэтык культуры, публіцыст, музычны прадзюсер, харавы дырыжор, таленавіты педагог, прызнаны аўтар густоўных апрацовак народнай музыкі*.

Як вядома, культуралогію разумеюць як навуку пра *агульнапрынятыя ў межах пэўнай супольнасці формы арганізацыі мыслення і паводзін*, якая пры іх вывучэнні шырока ўжывае кроскультурныя параўнанні і метады сумежных гуманітарных дысцыплін. Культуралагічная грань пераводу беларуска-адраджэнскай стратэгіі ў практыку айчыннай навукі моцна адбілася ў навукова-практычнай дзейнасці Шырмы, ўплываючай на *мысленне* тэарэтыкаў і аналітыкаў культыры і мастацтва Беларусі. Па ўзроўні сваіх тэарэтычных выкладак, прысвечаных традыцыйнай і прафесійнай музыцы (адпаведна, музыцы *вуснай традыцыі* і музыцы *пісьмовай традыцыі*), закранаючых пытанні нацыянальнага мастацтва і літаратуры, ментальнасці і аксіялагічнай сферы жыцця беларусаў, асаблівасцей беларускага эпасу, інтэлектуальная спадчына Рыгора Шырмы відавочна змяшчаецца ў сферы тэарэтыка-культуралагічных даследаванняў. Інтэнцыі ж яго практычнай дзейнасці шмат у чым месцяцца ў рэчышчы практычнай культуралогіі, якая працуе з формамі грамадскіх *паводзін*.

Як збіральнік фальклору, тэарэтык і метадолаг палявых даследаванняў Шырма зрабіў шмат, паколькі ўжо ў пачатку XX ст. дакладна ведаў прыярытэтную задачу этнамузыколагаў (асабліва ў рэчышчы ўхіла тагачасных збіральнікаў у бок агульнаэтнаграфічных і філалагічных даследаванняў) – сістэмны збор беларускіх песенных мелодый. Толькі з 1907 па 1937 гг. ён запісаў больш за 1000 мелодый [1, *16*] і на працягу далейшай дзейнасці значна пашырыў аб'ём і геаграфію ўласных сістэмных фальклярыстычных даследаванняў.

У якасці эдытара, друкара помнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў, Шырма аддана працаваў з 1929 г. (першая друкаваная падборка фальклорных песень у «Беларускім календары»). Потым былі «Двести белорусских народных песен» (1958) і фундаментальны чатырохтомнік «Белорусские народные песни» (1959 –1976 гг.). У яго выданнях – сапраўды геніяльныя (па рэпрэзентатыўнасці багацця беларускай песні) выбар і камбінацыя тыпавых напеваў, іх дакладная натацыя і захаванне каранёвай рытмікі, што зусім не проста ў традыцыйным меласе. На эдытарскім рахунку Шырмы – рэдагаванне фальклорных зборнікаў Генадзя Цітовіча, Мікалая Чуркіна, Эдуарда Ледаховіча, Зінаіды Мажэйка. Відавочна і вельмі каштоўна, што пры аналізе фальклору Рыгор Раманавіч паспяхова

дзейнічаў міждысцыплінарна (у культуралагічным ключы): і як філолаг, і як этнамузыколаг [1, *39*].

У галіне соцыякультурнай практыкі Рыгор Шырма align="justify" рознабакова рэалізаваў свой талент як тэарэтык культуры (аналізуючы яе ад сучаснасці да эпічнага пласта, які ён адчуваў у традыцыі беларусаў [5, *158–159*]) і на ўзроўні кроскультурных параўнанняў (напрыклад аналіз узаемаўплываў нашага і ўкраінскага фальклору [1, *38*]). Як публіцыст Шырма няспынна змагаўся з вульгарызацыяй і спрашчэннем беларускага мастацтва і народнай песеннай культуры, якую амаль абагаўляў. Шмат разоў ён пераканаўча выступаў за дакументальную этнічную аснову творчай дзейнасці як паратунак ад безгустоўнасці і графаманіі. Як музычны прадзюсер і харавы дырыжор, таленавіты педагог, аўтар надзвычай густоўных апрацовак народнай музыкі, ён сфарміраваў прыярытэты адэкватнага прадстаўлення народнай песні на вялікай сцэне. Капэла Шырмы была прызнана адным з вядучых харавых калектываў былога СССР, пад яго кіраўніцтвам дала звыш 5000 канцэртаў і ўзяла ўдзел у запісе 14 музычных дыскаў, а яе кіраўнік атрымаў ганаровыя званні «Народны артыст БССР» (1949) і «Народны артыст СССР» (1955).

Як часта бывае, многія з інтэнцый, свядома ці спантанна вынайдзеных у працэсе жыцця і творчасці пэўнай асобы, паглыбляюцца, распрацоўваюцца, выкарыстоўваюцца не самім аўтарам, а яго паслядоўнікамі (часам і яго эпігонамі). Калі ўлічыць, што культуралагічныя інтэнцыі дзейнасці Рыгора Шырмы заўсёды былі шырока накіраваны на культуру і мастацтва беларусаў увогуле, падаецца, што становішча з масавай распрацоўкай сваіх дасягненняў тэарэтыкамі і практыкамі фальклору, філолагамі, музыкамі, дырыжорамі, мастацтвазнаўцамі і культуролагамі Беларусі Рыгор Раманавіч вітаў бы ад усяго сэрца.

## ЗАЎВАГІ

*1. Курсіў і выдзяленне доктара мастацтвазнаўства, прафесара, акадэміка Ігара Мацієўскага.

*2. У часы Платона паэтычныя творы не дэкламаваліся, а спяваліся [2, *32*].

*3. Парафраз вершаваных радкоў Восіпа Мандэльштама: *«Чтобы вырвать век из плена, чтобы новый век начать, / Узловатых дней колена надо флейтою связать…»*.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Варфоломеева, Т.* Григорий Ширма / Т. Варфоломева // Працяг будзе… / укл. М. Козенка. – Мінск, 2004.

2. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск, 2009.

3. *Мациевский, И.* Возрождение этнической музыки и специальное образование / И. Мациевский // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння,

захавання, пераймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29–30 крас. 2009 г.) / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009.
4. *Розин, В.* Семиотические исследования / В. Розин. – М., СПб., 2001.
5. *Шырма, Р.* Песня – душа народа / Р. Шырма. – Мінск, 1976.